**Эксперымент**

### Ці шкодная вада з-пад крана?

У чарговым эксперымеце мы вырашылі пацікавіцца якасцю вады. Той "жыватворнай вадкасці", што цячэ з нашых кранаў.

**стар. 3**

**Тэма нумару**

### Правы маладога настаўніка

Тым, каму патрапіла працаваць настаўнікам, неабходна ведаць асноўныя пункты «Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі…».

**стар. 4-5**

**Вакол нас**

### Дабраліся да вытокаў

Унікальнае нізіннае балота ў цэнтры горада з кастрычніка засыпаюць пяском.

**стар. 6**

экалагічная газета Гарадзеншчыны

# Pro Nobis*

распаўсюджваецца бясплатна 5(9) лістапад 2006

*Меркаванне спецыяліста*



**Алег Созінаў**

**кандыдат біялагічных навук**

Гіпатэтычнай прычынай засыхання дрэваў магло стаць механічнае пашкоджанне каранёвай сістэмы падчас рэканструкцыйных прац. Але адно гэта не прывяло б да грунтоўных зменаў у жыццядзейнасці дрэваў. Хутчэй за ўсё, расліны ўжо былі пад уплывам грыбковых захворванняў, а пашкоджанне каранёў стала паскараючым згубу фактарам.

Акрамя таго, магчымая прычына - рэзкія перапады тэмператур. Зусім выключанае ўздзеянне такога фактара, як паніжэнне ўзроўню грунтовых вод. Немагчымасць апошняга тлумачыцца тым, што сённяшні стан Гараднічанкі (яе высыханне) існуе ўжо на працягу многіх год, і тут не было рэзкіх зменаў.

Высвятленне сапраўдных прычынаў патрабуе спецыяльных навуковых даследванняў.



## Зруйнаваныя рэканструкцыяй?

**Старыя дрэвы загінулі ў парку Жылібера. Яны былі пашкоджаныя падчас мінулагодняй рэканструкцыі "Швейцарскай даліны".**

Група дрэваў (былі пасаджаныя пасля вайны), якія раслі паабапал Гараднічанкі ў тым куце парка, што на рагу вуліцы Элізы Ажэшка і плошчы Леніна, стаіць счарнелаю з самай вясны. Каля 11 ясеняў і 1 ліпа так і не вярнуліся да жыцця пасля добраўпарадкавання тэрыторыі парку.

- Калі ішла рэканструкцыя даліны Гараднічанкі, дрэвы падкапалі, а потым засыпалі новым грунтам, што і пашкодзіла іх, - мяркуе супрацоўніца "Зелянстрою" Ала Жыгала. - Мы вельмі чакалі, што яны пойдуць у рост увесну але, на жаль, гэтага не адбылося.

Як заўважаюць многія з гарадзенцаў, наш горад страчвае сваё зялёнае аблічча. Сёння ўжо не толькі ў выніку праектаў "добраўпарадкавання", але і па халатнасці, ці па недахопу ведаў.

Праект Міністэрства спорту і турызму "Рэканструкцыя русла Гараднічанкі, аднаўленне "Швейцарскай даліны" ажыццяўляўся ў мінулым 2005 годзе. Выканаўчай арганізацыяй з'яўляўся Гарадзенскі аблвыканкам. У ліку астатніх прац, як можна заўважыць неўзброеным вокам, былі замена грунта, а таксама пракладка ліўневай каналізацыі.

Па словах А. Жыгала, дрэвы будуць выкарчоўваць. Гэта зробяць зімой, калі падмерзне зямля. Тады цяжкая тэхніка не пашкодзіць газон і астатнія дрэвы. Увесну насадзяць новыя.

**Вольга Сташко**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Далучайся

**Месяц таму скончыліся чарговыя назіранні за птушкамі, якія штогод праводзіць грамадскае аб’яднанне “Ахова птушак Бацькаўшчыны”. Яно гуртуе вакол сябе як аматараў, так і дасведчаных арнітолагаў і выкладчыкаў універсітэтаў.**

### “Крылаты дазор”

Паказальна, што значную частку сяброў арганізацыі складае моладзь - добрая перспектыва на будучыню. З гэтай прычыны і паўстаў яшчэ ў 2004 годзе клуб АПБ “Крылаты дазор”, які, у першую чаргу, накіраваны на тых дарослых, хто хоча і можа працаваць з дзеткамі і падлеткамі – або ў школе, або па-за ёй. Зараз па ўсёй Беларусі створаны каля 140 клубаў-гурткоў “Крылаты дазор”, у кожным з якіх займаюцца ад 5 да 70 дзетак! Асноўная дзейнасць: знаёмства з жывёльным і раслінным светам, з арнітафаўнай Беларусі; арганізацыя назіранняў за птушкамі, экалагічнае выхаванне; удзел у акцыі АПБ “Птушка года” (конкурсы на лепшы малюнак, казку, фотаздымак) , удзел у рэспубліканскім падліку зімуючых птушак і сусветных днях назіранняў за птушкамі (World Birdwatch), у летніках для настаўнікаў і падлеткаў, трэнінгах і сэмінарах. Для больш эфектыўнай працы клубаў, кіраўнікам дасылаюцца метадычныя распрацоўкі па арганізацыі сустрэч, экалагічных гульняў.

### “Дзікі квадрат”

Таксама, клубы могуць прыняць удзел у праграме “Дзікі квадрат”. Яна накіравана на вывучэнне школьнікамі найбольш звычайных прадстаўнікоў флоры і фауны вакол школаў. Дзякуючы атрыманым падрабязным методыкам, біноклям, вызначальным табліцам, клубы самастойна змогуць працягваць вывучэнне. На пачатку лістападу адбылася заключная канферэнцыя праекту. На ёй былі падведзены вынікі вывучэння “Дзікіх квадратаў” па ўсёй Беларусі. Узнагароды атрымалі найбольш актыўныя ўдзельнікі.



**Вучні гімназіі №1 назіраюць за птушкамі**

P.S.Калі вы жадаеце далучыцца да АПБ і клубу “Крылаты дазор”, ці атрымаць больш падрабязную інфармацыю , звяртайцеся

*да Дзьмітрыя Вінчэўскага*
*тэл.: (0152) 730-118, маб. (029) 6141666*
*сайт: www.ptushki.org*
*Э-пошта:/APB_Hrodna@tut.by/*

**Яўген Сліж**

# Гродна ў 2056 годзе

***ФЕЛЬЕТОН ад Віктара В.***

Нашыя праўнукі будуць утульна сябе пачуваць у горадзе-паркінгу, закладзеным бетоннай пліткай. Падцвярджэннем маёй прадбачлівасці паслужыць маршрут экскурсіі па Горадні, распрацаваны на 2056 год. Яго здабыў у адной турфірме адзін чэсны чалавек. Вось некаторыя ўрыўкі:

1. Наведванне месцаў нашае славы:

- Савецкай плошчы з гістарычным аповедам пра штогадовыя павелічэнні яе памераў, дзякуючы самаахвярнай працы будаўнікоў і кіраўніцтва; абавязковае распіццё піва каля моладзевага спартыўнага комплекса “Драмтэатр”, як дань павагі таму пакаленню;

- Газона імя Упраўлення Архітэктуры па былой вул. Горкага (цяпер Савецкая плошча) з урачыстым чытаннем лістоў падзякі шчаслівых гараджан за знос несучасных старых дамоў; абавязковае фота каля шыльды “Па газону не хадзіць”, як паказчык еўрапейскасці горада;

- Стадыёна імя Таннай пластмасы з абавязковым наведваннем хакейнай пляцоўкі і трамплліннай вышкі для скачкоў, каб паказаць спартовасць краіны;

- Рынка “ДзяржКарона” - месца, дзе калісьці было прадпрымальніцтва (выступ агітбрыгады на тэму “Аб шкодзе бізнэса ў нашым жыцці”);

- Парка імя Пяючага фантана і Вечнага агню (былы парк імя Жылібера); фатаграфаванне ў строі нявесты і жаніха (здаюцца ў пракат), распіццё піва, лаянка матам, як дань павагі да таго пакалення; дэманстрацыя рэдкага віда расліны “сасны звычайнай” з паслугай “Выражы ножыкам – Тут быў ...”

2. Завяршэнне экскурсіі пешай прагулкай па 12-палоснай развязцы вакол Савецкай плошчы (былы Стары горад), з якой адкрываецца цудоўны від на сучасны горад.

## Слова рэдактара

Каб зразумець, у якім стане знаходзіцца наша школа, дастаткова паехаць адбываць накіраванне ў вёску. Напрыклад, у Бераставіцкі раён.

Узровень развіцця вучняў немаленькай (каля 100 чалавек) базавай школы прыводзіць у аслупяненне: дзеці ў восьмым класе чытаюць па складах і голасна лаюцца расійскім матам, не зважаючы ні на каго. Зразумела, не ўсе, але пераважная большасць. Малодшыя чытаюць яшчэ горш. Лаюцца, што праўда, пакуль меней.

Толькі дзеці, на маю думку, не прычына, а хутчэй індыкатар, які яскрава паказвае, як працуюць настаўнікі, на якіх прынцыпах і маралях гадуюцца школьнікі. І тых і тых “можна зразумець”: школьны канфармізм даўно паглынуў і настаўнікаў і вучняў. Першыя думаюць, як атрымаць паболей грошаў, таму выконваюць зняважлівыя загады кіраўніцтва і зацята маўчаць, аб’яднаўшыся ў “правільныя ” і “няправільныя” суполкі. А пра дзетак узгадваюць, калі трэба ехаць на мерапрыемствы, ці калі “зламалі”, “пабілі” і г.д. Тым самым, раздзяляючы іх на “ненармальных” і “харошых”.

- На раённай інтэлектуальнай алімпіядзе дасталі сшыткі, кніжкі і ўсё спісалі, - дзеліцца ўражаннямі “харошы” школьнік. Адным – прэмія, другім – грамата. Ну, поўны кансэнсус. Праўда вось, колькасць тых, хто нікуды не ездзіць, ці “ненармальных” куды большая. І іх прымусілі зразумець, што яны псуюць усе паказчыкі. Таму на пытанне настаўніка “Чаму не быў у школе?”, тыя шчыра адказваюць “А на **я мне тая школа ?!”

Пакуль настаўнікі будуць рабіць кампазіцыі з кветак на раённыя святы; рыхтавацца да конкурсаў “Лепшыя клумба, стэнд, клас і г.д.”; маляваць карціны на ўсё тыя ж конкурсы і падпісваць іх прозвішчамі “харошых” вучняў ; зацята маўчаць, каб атрымліваць прэміі, датуль “ненармальныя” дзеткі будуць “псаваць паказчыкі”. Ці перастануць хадзіць у школу. То, можа, і лепей?

# Ці шкодная вада з-пад крана?

**У чарговым эксперыменце, мы вырашылі пацікавіцца якасцю вады. Той "жыватворнай вадкасці", што цячэ з нашых кранаў. А таксама тым, якія непрыемнасці можа выклікаць вада, што не адпавядае санітарным нормам.**

Першае пытанне мы запланавалі высветліць шляхам самастойнага аналіза на базе школьнай лабараторыі. Але тут якраз прыйшлі школьныя канікулы, таму сёння толькі тэарытычныя асновы. Практычныя ж вынікі паважаны чытач зможа ўбачыць у наступным нумары.

### Тры крыніцы

Сёння, па словах галоўнага тэхнолага водаканала, Горадня спажывае ваду з трох падземных водазабораў: "Пышкі" ( вул. Болдзіна, праспект Будаўнікоў, БЛК, Пярэселка), "Чэхаўшчызна" (занёманская частка гораду – вуліцы Савецкіх памежнікаў, Рэпіна, мікрараён Фолюш, вуліца Гарнавых, цотны бок праспекта Кляцкова, пасёлкі Паўднёвы і Фабрычны), а таксама самага вялікага, што забяспечвае 60% плошчы ўсяго горада – "Гожка" (цэнтральная частка горада і ўсе астатнія раёны, што не ахопліваюцца папярэднімі двума водазаборамі).

### Санэпідэмстанцыя дае дабро

Як паведаміла нам урач-гігіеніст занальнага цэнтра Гарадзенскай санэпідэмстанцыі, якасць водаправоднай вады ацэньваецца па трох паказчыках:

-арганаліптычны аналіз;
- мікраарганічны;
- хімічны.

**Уздзеянне рэчываў, што могуць стрымлівацца ў вадзе**

| Рэчывы | Уздзеянне на арганізм |
|---|---|
| жалеза | алергічныя рэакцыі, захворванні крыві |
| марганец | таксічнае ўздзеянне на палавую сітэму |
| хларыды | гіпертанія, захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы |
| сульфаты | дыарэя, жоўчна-мочакаменная хвароба |
| солі кальцыю і магнію | мочакаменная хвароба, гіпертанія, скляроз |
| нітраты і нітрыты | метгемаглабінемія, рак страўніка |



**Вада адпавядае дзяржаўным нормам. Ёй можна мыць рукі**

У першы паказчык увахоздзяць такія характарыстыкі вады, як пах, прысмак, колернасць, мутнасць. З дапамогаю мікраарганічнага аналіза вызначаецца прысутнасць жывых арганізмаў, а хімічны дазваляе высветліць канцэнтрацыю шматлікіх неарганічных і арганічных рэчываў у вадзе.

Асаблівасцю вады з падземных крыніц на Беларусі з'яўляецца павышанае стрыманне жалеза і марганцу, таму ўсюды на водаканалах выкарыстоўваюцца станцыі абезжалезвання.

Па звестках урача-гігіеніста, якасць нашай вады адпавядае дзяржаўным нормам.

### Фільтр не пашкодзіць

Нормы ёсць нормы. Але памятаючы універсітэцкія лекцыі, дзе шмат разоў прыводзіліся ў параўнанне з нашымі значэнні еўрапейскіх ПДК (якія чамусьці заўсёды былі ніжэйшымі), пачынаюць закрадвацца сумненні. Яны мацуюцца аднойчы ранкам, калі з крана, што раве, як раз'ятраная жывёла, выплёскваецца нешта невызначанага колеру.

Тады пачынаеш думаць аб якасным фільтры. Асабліва калі ўлічыць сведчанні навукоўцаў, што высветлілі, якія захворванні выклікаюць розныя хімічныя рэчывы, што могуць стрымлівацца ў вадзе (табліца).

**Вольга Сташко**

## Спытаем у людзей

Каб ацаніць сапраўдную сітуацыю, трэба звярнуцца да непасрэдных карыстальнікаў. Гэта мы і зрабілі – апыталі каля 40 чалавек. Мы задалі наступныя пытанні: ці п'еце Вы сырую ваду з-пад крана, ці задаволены Вы яе якасцю? Не выкарыстоўваюць водаправодную ваду для піцця 54 %; час ад часу – 16%; заўсёды п'юць – 30%. Не задаволена якасцю большасць – 86%; 8% не наракае; не заўсёды задаволены 6%. А адзін чалавек даў «добрую параду»: пракіпяціў і піць можна.

**Ці п'еце Вы сырую ваду з-пад крана?**




**Ці задаволены Вы яе якасцю?**



# Настаўнікі ў раёне

**Вясковыя настаўнікі выбіраюць бульбу і чысцяць буракі замест выкладання, ды яшчэ й задарма.**

## «Паедзеце ў Пархімаўцы»

Калі я першы раз прыехаў у Бераставіцкі раённы аддзел адукацыі, каб даведацца, у якой вёсцы я буду працаваць, сустрэўся перад кабінетам начальніка з жанчынай. Яна цудоўна размаўляла па-беларуску (прынамсі са мной).

- Прыедзеце да нас у Пархімаўцы, нам патрэбны біёлаг, - рашуча прамовіла мая суразмоўца.

- Не, я буду ў іншай школе, - спакойна адказаў я, ведаючы, што ёсць месцы ў іншых вёсках.

Праз два тыдні я разам з начальнікам Райана імчаў у тую самую вёску.

- Мы уже с ним знакомы, - адказала дырэктар такім галасам, што ўсе мае ілюзіі аб вясёлым жыцці зніклі.

## Жыллё

Праз гадзіну чакання мяне павялі паглядзець школьны інтэрнат. Там акрамя чатырох сцен не было нічога: ні вады, ні прыбіральні, ні нават кухні.

- Заселяйся, че ты, тут так прикольно, - запрашала маладая настаўніца-жыхарка.

Там смярдзела мачой.

Пасля доўгіх угавораванняў і абяцанняў плаціць 15 долараў і быць ціхім-прыціхім, мяне згадзілася ўзяць на кватэру цудоўная жанчына. У мінулым настаўніца рускай мовы ў Азербайджане, а цяпер тэхнічка, Вера Васілеўна. Не гледзячы ні на што, я быў шчаслівы.

## Працоўныя будні

Пачаліся першыя працоўныя дні... Падчас педагагічнай нарады мяне паставілі перад фактам: хімія, біялогія, прыродазнаўства, праца, – такім чынам роўна 18 гадзін. Тая мінімальная стаўка, якая прадугледжваецца законам. Быў хацеў сказаць, што я па спецыяльнасці эколаг...

- Бузеце весці, што скажам, можа шчэ й спевы, -папярэдзілі мяне. І дадалі - Вы іграеце на інструменце?!

Балазе, музыкальных здольнасцяў у мяне няма.

Першага верасня была святочная лінейка. Голас настаўніцы-вядоўцы ніхто не чуў, бо вецер быў не ў той бок. Выканалі ўсе фармальнасці: "акапэльна" спелі гімн, паднялі сцяг, далі слова для віншаванняў некаму з раёна. Нечаканасцю з'явілася страта прытомнасці адным семікласнікам, якога я гераічна панёс на руках у піянерпакой (куток БРСМ). Можа, вырашылі, што там свежага паветра больш. Пра мяне сталі гаварыць усе.

Калі ішоў на ўрок, хваляваўся ў першую чаргу праз адсутнасць метадычнай падрыхтоўкі. Наведаў колькі ўрокаў у сваіх калег і зразумеў, што галоўнае ў гэнай справе - умець знайсці падыход да дзетак. Але, як аказалася, памыліўся. Бо найважней паразумецца з адміністрацыяй. І тут, як гаворыцца, найшла каса на камень. То патрэбныя 4 газеты выпісваць адмаўляюся, то патрабую, каб паказалі мой кантракт (паўтара месяца працую ўжо), то каб далі пазнаёміцца з калектыўным дагаворам, то настойваю не адлічваць грошы ў прафсаюз, у які яшчэ афіцыйна не ўступіў ("у нас дастаткова вусна аб гэтым паведаміць"), то кантактую з "ненадзейнымі" калегамі. Адным словам, "нервы матаю".

**Найважней паразумецца з адміністрацыяй. І тут як гаворыцца, найшла каса на камень**

## «Плюс» за буракі

Затое не прапусціў ніводнага дня на ўборцы бульбы і буракоў (амаль два тыдні). А гэта ого-го, які плюс, бо грошы, заробленыя мною, усе, да апошняга рубля, будуць пераліченыя ў фонд школы. Няхай цяпер за іх купяць дзеткам дзіві-дзі, каб тэлевізар, што купілі з мінулых буракоў, не пыліўся самотна ў куце.

**Віктар Валько**




Страявая хада на школьных лінейках адпрацаваная добра

## Каму «паложана»?

Я была размеркавана ў свой "родны" раён і трапіла ў школу, якую сама скончыла пяць гадоў таму. Апошняе, канешне, мне маральна дапамагала: знаёмыя настаўнікі, школьныя памяшканні, кабінет біялогіі. А вось працэс уладкавання на працу непрыемна ўразіў: запаўненне шматлікіх дакументаў, падпісанне неіснуючага дагавора (мне прапанавалі падпісаць незапоўненую форму) і адказ на адпаведнае пытанне: "Пад'ёмных Вам не паложана". А дзе тое "не паложана" ці "паложана", не паказалі. Як даведалася пазней, на некаторых з маладых спецыялістаў прыказы на атрыманне пад'ёмных усё ж былі падпісаныя. На мой погляд, гэта ставіць нас, маладых настаўнікаў, у няроўнае становішча адзін перад адным. А мы пакуль нічым не адрозніваемся: ні катэгорыяй, ні стажам.

На гэтым фоне словы аб падтрымцы і стымуляванні ўсіх маладых спецыялістаў выглядаюць недарэчна. Які можа быць стымул, калі твой працоўны шлях так пачынаецца.

**Гелена Белязюн**

# Літара закону

**Тым, каму патрапіла працаваць настаўнікам, неабходна ведаць асноўныя пункты «Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі...». Некаторыя з якіх мы прыводзім ніжэй.**

## Грашовая дапамога

Маладым спецыялістам, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю па педагагічных спецыяльнасцях, выплачваецца грашовая дапамога за 45 каляндарных дзён за кошт бюджэтных сродкаў установай адукацыі з разліку месячнай стыпендыі, назначанай ім у апошнім семестры.

Выплата грашовай дапамогі ажыццяўляецца наймальнікам у месячны тэрмін пасля заключэння працоўнага дагавора з маладым спецыялістам у поўным памеры незалежна ад колькасці выкарыстаных ім дзён адпачынку.

Выпускнікам устаноў адукацыі, якія атрымалі магчымасць самастойнага працаўладкавання, грашовая дапамога не выплачваецца.

Выпускнікам, накіраваным пасля заканчэння ўстановы адукацыі на работу ў іншую мясцовасць, гарантуюцца выплаты, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Маладым спецыялістам, якія прыбылі на працу па персанальнаму размеркаванню, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі затрат на наём жыллёвых памяшканняў у грамадзян.

## Звальненне

Звальненне маладых спецыялістаў або перавод іх на работу, якая не звязана з атрыманай спецыяльнасцю, кваліфікацыяй, да закачэння абавязковага тэрміну работы па размеркаванню забараняецца, за выключэннем звальнення па ініцыятыве наймальніка за парушэнні працоўнай дысцыпліны і ў выпадках, прадугледжаных у пунктах 1 ( у адносінах да ліквідацыі арганізацыі), 2 і 6 артыкула 42, пунктах 1-4 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**PN**

### *Каментар спецыяліста*

**Карэўская Наталля Валер'еўна**

**спецыяліст па прававых пытаннях гаркама прафсаюза працаўнікоў адукацыі і навукі**

Малады настаўнік пры ўладкаванні на працу павінен быць азнаёмлены пад роспіс з наступнымі дакументамі:

1) калектыўны дагавор супрацоўнікаў школы;

2) правілы ўнутранага працоўнага распарадку;

3) правілы тэхнікі бяспекі.

Акрамя таго, прафсаюзы раяць адміністрацыям школы ўключаць палажэнне аб грашовай матэрыяльнай дапамозе ў калектыўны дагавор. Такім чынам забяспечваецца абавязковае выкананне гэтага пункта. Памер дапамогі вызначаецца па ўзгадненні адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта школы. Ён можа складаць 0,25; 0,5 і 1 базавую велічыню на месяц.

Адлічваць з заробку прафсаюзны ўзнос могуць толькі ў тым выпадку, калі настаўнік аформіў пісьмовую заяву на ўступленне ў прафсаюз і, адпаведна, даў на гэта згоду.

Дапамогу па прававых пытаннях можна атрымаць па тэл.: 74-07-13

# Няма парадку

**Мы звярнуліся да маладых настаўнікаў, што толькі ў гэтым годзе ўладкаваліся на працу, з наступнымі пытаннямі:**

1) Ці азнаёмілі Вас з калектыўным дагаворам у першыя дні працы ў школе?

2) Ці адлічваюць з Вашага заробку прафсаюзны ўзнос?

3) Калі так, то ці ўступалі Вы ў прафсаюз на працоўным месцы?

Нам удалося апытаць толькі 18 чалавек, але затое яны працуюць у розных раёнах. Такім чынам мы ахапілі практычна ўсю Гарадзеншчыну.

Калі аналізаваць агульную карціну, то атрымоўваем наступныя вынікі: былі азнаёмленыя з калектыўным дагаворам 56%, не былі – 44%; 70% плацяць прафсаюзны ўзнос праз утрыманне з заробку, 30% - не; уступалі ў прафсаюз 41%; 59% не ўступалі.

Параўноўваючы сітуацыю ў горадзе і раёне, можна адназначна сказаць: гарадзкія школы ў прававых адносінах працуюць лепш. Так у Горадні, на 72% азнаёмленых прыпадае толькі 25% неазнаёмленых з калектыўным дагаворам. У той жа час, у раённых школах гэтыя лічбы адпаведна роўныя 40% і 60%. У гарадзскіх школах лік тых, у каго адлічваюць грошы на прафсаюзны ўзнос (75%) супадае з колькасцю ўступіўшых у прафсаюз. А вось у школах, што знаходзяцца далей ад цэнтра і, адпаведна, ад кантролю, у 67% маладых спецыялістаў гэтыя грошы ўтрымліваюць незаконна: на 6 чалавек, у якіх у разліковых лістах ёсць радок "прафсаюзны", толькі 2 уступалі ў гэтую арганізацыю.

**В.С.**

**Ці азнаёмілі Вас з калектыўным дагаворам у першыя дні працы ў школе?**

**горад**




**вёска**




**Ці адлічваюць з вашай зарплаты прафсаюзны ўзнос?**

**горад**




**вёска**




**Ці ўступалі Вы ў прафсаюз?**

**горад**




**вёска**



## У ціхім балоце вялікая сіла

*Гелена Белязюн*



Сярэдзіна мінулага стагоддзя ў навуцы адзначылася надзвычайным ростам папулярнасці такога панятка як “сапрапель”. Пасля ажыятаж, нібыта, сціх. І толькі хто-небудзь у ціхай размове з сябрам мог паскардзіцца на болі ў пазваночніку, а ў адказ пачуць: Ведаю... Было... Спрабаваў... Сапрапелевымі мазямі ратаваўся”. Што ж такое сапрапель?

Прыкладна 12-15 тысяч год таму назад на тэрыторыі нашай краіны ў выніку сыхода апошняга ледавіка ўтварылася мноства азёр. Пасля ў іх з’явіліся жывыя арганізмы: водныя расліны, мікраскапічныя водарасці, мяккацелыя... Усё гэта пасіўна перамяшчалася плынню, паступова адмірала, асядала на дно. Потым у справу ўключаліся мікраарганізмы, якія паступова перапрацоўвалі гэты субстрат у новую субстанцыю – сапрапель (ці актыўны глей).

Сапрапель складаецца з розных кампанентаў: вітаміны групы В, амінакіслоты – гэта ад мікраарганізмаў; бялкі, гармоны – гэта ад фіта- і заапланктона. Таму яго ўжыванне ратуе ад радыкуліта, значна паляпшае скуру і поўсць жывёл. Таўшчыня сапрапеля ў азёрах часцей складае 5-10, а ў некаторых месцах – 30 м (возера Судабль у Смалявічскім раёне).

Сапрапелевыя залежы – гэта і захаванне каштоўнай інфармацыі аб мінулым клімаце, і своеасаблівы летапіс развіцця расліннага і жывёльнага свету ў азёрах і на блізкіх да іх тэрыторыях.



**Балота - будучы лекавы рэсурс**

Сапраўды, сапрапель гэта дзіўны “твор” прыроды, які можа стаць каштоўным лекавым рэсурсам будучыні.

*Пад пагрозай*

# Дабраліся да вытокаў



**Знаходжанне вытока Гараднічанкі зараз цяжка вызначыць**

**Унікальнае нізіннае балота ў цэнтры горада з кастрычніка засыпаюць пяском.**

Вялікая куча прывезенага пяску патроху хавае пад сабой незвычайны для горада прыродны біятоп, які месціцца за заапаркам паміж вуліцамі Каханоўскага і Пралетарскай. Выглядае на тое, што на яго месцы збіраюцца ставіць нейкі будаўнічы аб’ект. Ці так гэта дакладна, і якая арганізацыя з’яўляецца заказчыцай будаўніцтва, нам пакуль не ўдалося высветліць.

-Я быў вельмі непрыемна ўражаны: аднойчы прыйшоў і пабачыў, што засыпаюць нашую пробную пляцоўку. Разам з калегамі з Гродзенскага Дзяржуніверсітэта мы вядзем вывучэнне русла ракі Гараднічанкі, і менавіта гэтае балота было адным з аб’ектаў нашых даследванняў, - абураецца навуковец і геабатанік Алег Созінаў.

Балота раней даходзіла да пасёлка Падкрыжакі. Хутчэй за ўсё, яно было месцам вытока Гараднічанкі. Пасля меліярацыі, бліжэй да горада, застаўся толькі невялікі лапік. Калі на ім будзе нешта пабудавана, то, як кажа Алег Віктаравіч, будзе тры праблемы.

Па-першае, мы страцім унікальны куток прыроды: нізіннае балота ў цэнтры горада – гэта сапраўдны цуд, тым больш, што на ім нават гнездаваўся балотны лунь.

Па-другое, вадаём зараз з’яўляецца буферам, які трымае адносна пастаянным узровень вады ў Гараднічанцы.

Калі ж яго не стане, рака можа высахнуць.

І, нарэшце, калі ўжо будаваць, то на сухім месцы, бо пабудаванае на балоце – ненадоўга.

**Вольга Сташко**

*Вольга Сташко*



# Памяні, Бог, хто ў яме, паздароў, Бог, хто з намі!

**Памяць – неабходная ўмова выжывання рода і нацыі. Без памяці няма каранёў. Няма каранёў – няма моцы і прагі да жыцця. Таму беларус помніць сваіх продкаў.**

## Даты

У каталікоў памінанне памёршых адбываецца 1 раз у год – на Задушны дзень. Яно мае строгую прымеркаванасць да канкрэтнага дня – 2 лістапада. Праваслаўныя ж праводзяць памінанні тройчы на год:

1) зімою – Дзяды масленічныя;

2) улетку – Дзяды траечныя;

3) увосень – Дзяды восеньскія або Асяніны.

## Значэнне

Восеньскія Дзяды, самыя галоўныя ў цыкле памінальных дзён, абумоўленыя ахвярапрынашэннямі і падзякамі чалавека Духам продкаў за плён і здабыткі працоўнага года. Гэты абрад мае глыбокія карані – ад тых часоў, калі нашы продкі-земляробы аддзячвалі памяццю Дзядам за здабыты ўраджай і прырост жывёлы.

## Падрыхтоўка

Гэта была жаночая справа. З самага ранку, рыхтуючыся да сустрэчы "шаноўных гасцей", гаспадыням трэба было:

- вымыць чыста падлогу, вокны, сталы;

- павесіць на абразы новыя набожнікі;

- пазасцілаць ложкі новымі святочнымі покрыўкамі;

- падрыхтаваць памінальныя стравы – канун, бліны, булачкі, бублікі, кашу, галушкі, смажаную бульбу з мясам ды каўбасой.

Мужчыны ж тапілі лазню, і ўся сям'я чыста мылася і апраналася ў святочнае адзенне.




**Памінальная малітва на Дзяды ў Курапатах**

## Памінальная вячэра

Усе дзеянні падчас яе былі строга рэгламентаваныя. Галоўным у ажыццяўленні паслядоўных рытуальных дзеянняў быў старэйшы член сям'і, гаспадар:

1) ён запальваў свечку перад абразамі і маліўся за памёршых, да яго далучаліся і астатнія;

2) усе падыходзілі да стала, але перш чым сесці самім, гаспадар запрашаў зрабіць гэта "дзядоў-радзіцеляў";

3) садзіліся за стол, не прыціскаючыся адзін да аднаго, каб не выціснуць памёршых продкаў, якія, як лічылася, прысутнічалі ў гэты дзень за сталом;

4) для іх ставілі асобную талерку, у якую адкладвалі па лыжцы кожнай стравы і налівалі ў асобную чарку гарэлкі;

5) жывыя выпівалі толькі па тры чаркі, перад кожнай з якіх гаспадар выказваў розныя зычэнні продкам і прашэнні да Багоў;

6) разыходзіцца не спяшаліся – паеўшы, успаміналі пра жыццё, учынкі, добрыя справы памёршых родзічаў;

7) закончыўшы вячэру, ішлі спаць, але са стала не прыбіралі – продкі, як верылі, працягваюць сілкавацца да самага ранку.

## Павер'і

У народзе лічылася, што:

- у гэты дзень продкі выходзілі з царства мёртвых і наведвалі сваіх родных і блізкіх;

- першы спечаны для вячэры блін трэба разарваць і паставіць у талерцы на акно – парам ад яго ласуюцца душы продкаў;

- кожны невядомы гук, рух у двары, хаце ці за сталом сведчыць аб прысутнасці дзядоў.

# Чарнобыль: Альбом




**Канцэпцыя Дзяніса Раманюка; укл. Дзяніса Раманюка, Ігара Бышнева, Анатоля Клешчука.**
**259 ілюстрацый.**

**Замовіць можна праз інтэрнэт: www.knihi.net**

**Цана: 75 000 р.**

Што адбылося і што адбываецца на забруджаных тэрыторыях, азначаных аўтарамі адным ёмкім словам: Зона?

У аснову кнігі пакладзеныя арыгінальныя вынікі даследаванняў, праведзеных аўтарамі, а таксама найбольш значная інфармацыя аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС, даступная з іншых крыніцаў.

Пакінутая чалавекам прырода Зоны, яе раслінны і жывёльны свет апынуліся ва ўмовах небывалага эксперыменту – сітуацыя, адлюстраваная ў раздзеле «Прырода». Раздзел «Народ» прысвечаны аўтэнтычнай народнай культуры Зоны, з яе традыцыямі і абрадамі, фальклёрам, а таксама строямі, ткацтвам, жывапісам, дойлідствам – скарбам страчанае цывілізацыі. Сама аварыя, у кантэксце жыцця людзей на забруджаных тэрыторыях да і пасля выбуху, адлюстраваная ў раздзеле «Гісторыя». Самы балючы раздзел – «Чалавек» – адлюстроўвае людзкія пакуты, звязаныя з магчымымі наступствамі радыяцыі.

Гэты альбом – своеасаблівая энцыклапедыя чарнобыльскай катастрофы. Ён дае чытачу – як беларускаму, так і сусветнаму – магчымасць скласці для сябе поўнае ўяўленне пра тую бяду, што ўжо 20 гадоў уплывае на лёс цэлае краіны – Беларусі.



**Калі ў хаце загрымеў чыгунок, я напэўна ведаў, што там гаспадарыць не чалавек, а жывёла. Толькі якая? Уявіце сабе, гэта была балотная чарапаха. Яна тупала па кухні, быццам хатняя гаспадыня, што збіраецца гатаваць вячэру…**
**Аравічы, Хойніцкі раён. Чэрвень 2005 г.**

# Інтэрнэт




**www.adukacyja.info**

Для тых, хто хоча атрымаць адукацыю за мяжой, але не ведае ў каго спытаць.

Прапануем зазірнуць на партал ***www.adukacyja.info*** Сайт утрымлівае вялікую колькасць інфармацыі аб еўрапейскіх адукацыйных праграмах, вышэйшым і паслядыпломным навучанні, стажыроўках і навуковай працы. Пры гэтым, пра кожную краіну ёсць падрабязнае апісанне. Прысутнічаюць сусветныя, еўрапейскія і нацыянальныя рэйтынгі універсітэтаў.

Акрамя таго, Вы зможаце пачытаць інтэрв'ю з выпускнікамі праграм, здолееце абмеркаваць цікавыя пытанні ці атрымаць кансультацыю на форуме . Дык адчынім сваё window у Еўропу!




**www.belsoft.tut.by**

Выхад беларускамоўнай Windows чакаецца толькі ў наступным годзе. Але ўжо зараз Вы можаце карыстацца папулярнымі праграмамі на беларускай мове.

Сайт ***www.belsoft.tut.by*** змяшчае шматлікія пераклады кампутарных праграм. Яны разбітыя па раздзелах: Аўдыё, Відэа, Графіка, Забаўкі, Праца і інш. Таксама ёсць магчымасць знайсці беларускія субтытры да розных мастацкіх фільмаў. Усе спасылкі з'яўляюцца бясплатнымі!

Запампоўвайце і карыстайцеся, калі ласка!

## Гісторыя адной качкі




экалагічная газета Гарадзеншчыны
Pro Nobis*
распаўсюджваецца бясплатна №5(9) лістапад 2006

Галоўны рэдактар: **Віктар Валько**
**тэл. (маб.): 781 20 98**
Вёрстка: **Дзмітрый Гупянец**
Аб'ём: 1 умоўна друкаваны аркуш
Наклад 299 асобнікаў

Выдавец: Віктар Валько
Надрукаваны на абсталяванні выдаўца
Адрас рэдакцыі: Берастаўіцкі р-н, в. Пархімаўцы
Нумар падпісаны ў друк: 26.11.2006

Вашыя артыкулы і пытанні вы можаце дасылаць на E-mail:
**pronobis2004@mail.ru**